Падтрымай "Вясну" на PATREON

Магілёўскага журналіста Уладзіміра Лапцэвіча выклікалі ў міліцыю

16.06.2017 **Тэгі**: пераслед, свабода слова



Уладзімір Лапцэвіч

Па словах **Уладзіміра Лапцэвіча,** ён мусіў быў 15 чэрвеня наведацца ў міліцыю як асоба, у адносінах да якой вядзецца адмінпрацэс.Па інфармацыі mspring.online, яго абвінавачваюць у парушэнні артыкула 22.9 КоАП РБ і хочуць прыцягнуць за незаконны выраб прадукцыі СМІ для замежнай прэсы.

Гаворка ідзе пра матэрыялы ў штотыднёвік для беларусаў у Польшчы «Ніва» (Беласток). **Уладзімір Лапцэвіч** звярнуў увагу на тое, што ён з'яўляецца пазаштатным аўтарам, а не журналістам "Нівы":

> *– Пра маю дзейнасць патрэбныя органы, у першую чаргу падатковая інспекцыя, у курсе. Я плачу падаткі, у мяне ўсё празрыста. Я здзіўлены, што міліцыя зацікавілася маімі артыкуламі ў "Ніве". Тым больш, часопіс выходзіць толькі ў Польшчы,* – пракаментаваў цікавасць міліцыі журналіст.

Уладзімір Лапцэвіч распавёў, што позву яму прынеслі ўвечары 14 чэрвеня прама дадому.

> *– Там было пазначана, што мяне чакаюць 20 чэрвеня. Аднак я ператэлефанаваў маёру* ***Слаўнікаву,*** *да якога мне трэба было з'явіцца, і папрасіў яго перанесці сустрэчу на 15-га, каб хутчэй з усім разабрацца. З яго слоў я зразумеў, што пратакола пакуль яшчэ няма, але справа ўжо ідзе,* – заявіў карэспандэнт.

Праваабаронца **Барыс Бухель** бачыць у гэтым чарговы факт ціску на незалежных журналістаў:

– Відавочна, улады ўзяліся за нязручных журналістаў. Спачатку дзве справы супраць Аліны Скребуновой, цяпер выклікаюць Уладзіміра Лапцэвіча – і ўсё гэта ў кароткі тэрмін. Прычым па артыкуле КаАП, якая наўпрост парушае свабоду слова.


У міліцыі журналіста пратрымалі каля дзвюх гадзін. Па словах Лапцэвіча, у дачыненні да яго пакуль праводзіцца толькі праверка – яму задавалі загадзя падрыхтаваныя пытанні і склалі пратакол апытання.

> *– Маёр Яўген Слаўнікаў, як мне падалося, займаўся гэтай справай без належнага энтузіязму, нібы гэта фармальнасць. Я яму сказаў, што з'яўляюся не журналістам, а пазаштатным аўтарам, што ніякую інфармацыю я сам не здабываю, а толькі раблю агляды матэрыялаў прэсы*, – распавёў Лапцэвіч па выхадзе з Ленінскага РАУС.


Пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні на журналіста пакуль не складалі. 20 чэрвеня карэспандэнт "БелаПАН" зноў павінен з'явіцца ў міліцыю, каб даведацца, ці будзе распачаты адмінпрацэс альбо ці будзе скончана праверка.

Твитнуть









Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску


"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Шлях да "Вясны". Як прыходзяць да праваабароны – новы выпуск падкаста

Жыхара Смаргоні асудзілі на 1,5 года калоніі за абразу Лукашэнкі

“Не ядзернай зброі ў Беларусі!”. Як прайшоў “Чарнобыльскі шлях” у Варшаве. ШМАТ ФОТА

Затрыманні і шпіталізацыя Бабарыкі: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

"Каго вы называлі фашыстамі?" У Мінску судзяць дзіцячага паэта і выкладчыка Дзмітрыя Юртаева

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

"У думках з тымі, хто сустракае гэты дзень за кратамі". Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY